# Усмешка на фоне Чарнобыльскай станции

— Калі раптам знойдзеце на галінцы яблычак — можаце сарваць і есці спакойна, а вось лісткі з дрэў лепш не браць на памяць, — без жартаў інструктуе перад выездам у «зону» журналістаў, удзельнікаў міжнароднага трэнінгу, прысвечанага жыццю на тэрыторыях, што пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі, доктар біялагічных навук Валерый Кашпараў. Ён, дырэктар Украінскага НДІ сельскагаспадарчай радыялогіі Нацыянальнага ўніверсітэта біярэсурсаў і прыродакарыстання, усё свядомае жыццё—з 1986 года займаецца вывучэннем наступстваў сусветнай катастрофы.

Мы, журналісты самых розных СМІ з Украіны, Беларусі і Pacii, пасля праспуханых лекцый быццам і верым яму, але ж... Размова дзвюх калегаў паміж сабой перад выездам на экскурсію.

— Ты што, не ведала, што трэба было такое адзенне на сябе апранаць, каб выкінуць не шкада было... Ці адразу вымыць.

— Дык нам жа сказалі, што можна і ў звычайвым?

— Мала што сказалі. Лепш перастрахавацца.

— Ой, а ? Нам не шуба каштоўная, можа яе навыварат апрануць? Не, лепш я яе пакіну ў гатэлі, а на сябе апрану цёплы світар. Потым вымыю...

Розум усё ж бярэ верх і ў 20-градусны мароз калега едзе ў футры. Міжтым, сапраўды, складана адразу зразумець небяспечнасць-бяспечнасць знаходжання ў 30-кіламетровай чарнобыльскай зоне. На працягу амаль 23 гадоў вучоныя яе вывучаюць, абараняюць дысертацыі, але жах перад з'явай пад назвай «Чарнобыль» у людзей застаецца... Міжволі ўзгадваецца той самы 1986-ы, калі інфармацыю атрымлівалі толькі з вуснаў, а афіцыйна казалі, што не здарылася нічога, што можна назваць катастрофай. У тагачаснък газетах — невялічкія афіцыйныя паведамленні аб нейкай аварыі дзесьці ва Украіне — і ўсё. Яны, разам з сакрэтнымі дакументамі канца 80-х, цяпер сталі звычайнымі экспанатамі Кіеўскага музея Чарнобыля. Яго канцэпцыя ўвабрала так многа артэфактаў, што зноў становіцца вусцішна ад напаміну нядаўняй гісторыі, у якой Беларусі не пашанцавала больш за ўсё. Аб гэтым на тэрыторыі Украіны ўзгадваюць, але не часта.

Калегі і навукоўцы пасля двух дзён сумеснай працы сыходзяцца на адным — чым больш людзям растлумачваюць пра ступені небяспекі, тым больш недаверу да інфармацыі. Сіндром 1986 года? І ён таксама.

Групе, у якой не толькі журналісты, але і міжнародныя эксперты ПРААН, ЮНІСЕФ, МАГАТЭ, загадзя прапанавана ехаць у чарнобыльскую зону толькі па асабіотым жаданні. Тым не менш аўтобус поўны. Зусім іншая сітуацыя была роўна дзевяць гадоў таму. напярэдадні закрыцця Чарнобыльскай станцыі для наведвальнікаў. Тады прайшло толькі 14 гадоў пасля аварыі, і амаль што палова журналістаў, некім прапанавалі такую паездку, адмовілася паехаць у «зону».Я разглядаю фотаздымкі тых часоў і сучасныя і параўноўваю. Тое, што мы пабачылі 9 гадоў таму, цяпер канчаткова закрыта дпя прэсы.

Таму сёлета маршрут іншы. Пачынаецца ён традыцыйна — з уезду ў 30-кіламетровую зону. Між іншым, гэта зусім не круг, праведзены цыркулем вакол АЭС. Калі глядзець на карту, зона значна выцягнутая якраз у бок Беларусі. Кантрольна-прапускны пункт падтрапяткой назвай «Дзіцяткі» выклікае самыя супрацьлеглыя пачуцці ў маіх калегаў. Пашпарт правяраюць у кожнага, але ж, каб больш строга, чым памежнікі на мяжы Беларусь—Украіна, я не сказала б. Усё звычайна — да экскурсій тут звыклыя. Відаць, іншыя «экскурсанты» выклікаюць куды больш турбот. Іх фотаздымкі, або фотаробаты знаходзяцца тут жа, на міліцэйскай «дошцы гонару».

Спецыялісты, якія працуюць непасрэдна ў зоне, пацвярджаюць, што час ад часу злачынцы з абодвух бакоў мяжы спрабуюць знайсці прытулак у даўно кінутых людзьмі хатах. На іх сляды, у асноўным ў выглядзе сучасных пустых бутэлек з-пад спіртных напояў, натыкаемся і мы. Агенцтвам "Чарнобылінтэрінфарм» распрацаваныя маршруты, як у звычайным турагенцтве. Спачатку заязджаем непасрэдна ў горад з назвай, якая для свету даўно стала

жудасным сімвалам — Чарнобыль. Насамрэч, пейзаж тут нагадвае Нароўлю ці Брагін у сярэдзіне 90-х. Кінутыя дамы з пустымі вачніцамі — іх цяпер на беларускай тэрыторыі ўсё менш і менш. Частка будынкаў прыстасавана пад інтэрнаты, сталоўку, нейкія службы. Тут размешчана ўся неабходная інфраструктура, якая забяспечвае амаль што 3,5 тысячы чалавек усім неабходным.

— Толькі што дзіцнчага садка і школы ў нас тут няма. І суда. А так усё, што трэба, у тым ліку і спартзала. — расказвае наш суправаджальнік. — Людзі прыязджаюць сюды працаваць — хто кожны дзень вяртаецца дадому, а хто вахтавым метадам працуе: 15 дзён тут, 15 — дома. Работа самая рознан — ад абслугоўвання да навуковых даследаванняў.

Людзі ў Чарнобылі есць. кожны займаецца сваёй справай і на журналістаў асаблівай увагі не звяртаюць — прывыклі: ездзяць тут розныя, фотаапаратамі бліскаюць...

Наступны прыпынак аўтобуса— Чарнобыльская АЭС. З таго моманту, якя былатуту апошні раз, перад глядзельнай пляцоўкай на чацвёрты энергаблок тут з'явіўся манумент — далокі, якія трымаюць сімволіку «мірнага атама». Для калегаў гэтае месца — лепшы здымачны пункт, і фотаўспышкі пачынаюць зіхацець няспынна. Па чарзе становімся так, каб знакаміты чацвёрты блок быў за спінай.

— Увага, усмешка!

Ёсць здымак пад назвай “я тут была”. Будэе што сябрам паказаць. Насапрэч, тут не імкнуцца паменшыць небяспечнасць аб'екта пад казвай «Укрыццё». Станцыя абнесена калючым дротан, вакол усталяваны відэакамеры. і кават весці здымкі непасрэдна з глядзельнай плнцоўкі забаронена. Калі я тут была ў 2000 годзе, свет не ведаў яшчэ аб маштабных тэрарыстычных актах з вежамі-двайнятамі і правілы перасцярогі былі іншымі — не такімі строгімі. Сёння ўсё інакш.

БЯСПЕКА — самы галоўны клопат усіх, хто застаўся падтрымліваць жыццё побач з Чарнобыльскай станцыяй. І гаворка не толькі пра людзей, якія тут працуюць і за чыім здароў'ем — асаблівая пільнасць. Не толькі пра журналістаў ці іншых шукальнікаў прыгод, якія імкнуцца залезці за эксклюзівам туды, куды не трэба. Бяспечнасць — у сусветным маштабв. Бо вядома дакладна, штоўнутры чацвёртага энергаблока застаецца каля 95 % паліва, якое знаходзілася ў ім на момант аварыі. Зараз сумарная яго актыўнасць окладае прыкладна 16 мільёнаў кюры. Яшчэ ўнутры аб'екта 2 тысячы тон матэрыялаў, нкія могуць гарэць: графіт, кабель, пласцікат, драўляныя канструкцыі, Журналістам трох краін усё гэта дабро паказваюць на макеце, які расчыняецца. Скрыня Пандоры дае маг-чымасць уявіць сапраўдную небяспеку аб'екта. Насамрэч, прызнаюцца спецыялісты, яны пастаянна сустракаюцца са скпаданасцямі, бо доступ усярэдзіну энергаблока абмежаваны нават для спецыяльнай тэхнікі.

Міжтым, работы па ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай станцыі за 23 гады не прыпыняліся ніколі. Вада трапляла ў аб'ект, у ім адбываліся адпаведныя дэструктыўныя працэсы. Сёння спецыяльная апаратура дапамагае наглядаць за тым, што адбываецца ў разбураным энергаблоку. Гэта сапраўды ўнікальны і складаны праект, над якім працуюць не толькі ўкраінскія, але ж і міжнародныя аргамізацыі.

Сённяшні аб'ект «Укрыццё» — збудаванне, узведзенае над пашкоджаным чацвёртым блокам Чарнобыльскай АЭС. У гэтым выглядзе ён быў закончаны летась. Цяпер у праекце — новы «саркафаг», які будзе называцца «канфайнмент». Да 2012 года збудаванне ў выглядзе велізарнай аркі павінна закрыць сённяшні відарыс чацвёртага энергаблока. Пакуль што рыхтуецца тэрыторын, дзе будзе збірацца арка. Адна з умоў да новай канструкцыі — выгрузка з чацвёртага энергаблока ядэрнага паліва. Між тым, цяпер усе неразбураныя рэактары — пустыя, у іх няма ядэрнага паліва. Частка выгружана ў басейны вытрымкі на першым і другім энергаблоках. А частка перавезена ў сховішча адпрацаванага ядзернага паліва на тэрыторыі побач са станцыяй.

Усе гэтыя будынкі сёння ўнўпяюць эвычайны прамысловы пейзаж. Узгадваюцца словы маёй бабулі, якан казала, дк і многія старыя людзі ў той час: "І дзетаярацыя? Нічогажнебачна...» Вось будаўнічыя крамы, якія замерлі назаўсёды 23 гады таму — гэта недабудаваныя пяты і шосці энергабпокі Чарнобыльскай станцыі. Тым ке менш без тлумачэнняў вучоных складана зра-зумець: чаму вось тут радыяцыя ёсць, а вось тут, побач, яв няма.

— Я працаваў над праектам, які быў звязаны з забруджваннвм паветра, — кажа доктар біялагічных навук Валерый КАШПАРАЎ. — Нашы нямецкія калегі вызначылі, што ў зоне адчужэння канцэнтрацыя звычайных аэразоляў — палявых часцінак пылу — ніжэйшая, чым у еўрапейскіх Альпах, прыкладна такая, як у Антарктыдзе. Яны нам кажуць: сюды людзей з лёгачнымі захворваннямі трэба прывозіць— паветра такое чыстае. Мы ім: відаць, тамушта тут няма ніякай тэхнічнай дзейнасці. А яны лічаць, што, напрыклад, у Германіі асноўная праблема ў дачыненні да гэтых часцінак — аэразолі амомію, якія ўтвараюцца на мясцовых свінафермах. І зараз за станам паветра ў зоне адчужэння пастаянна вядуцца назіранні.

Асноўная ўвага вучоных сёння звернута да рэчыва пад назвай цэзій-137. Між іншым, па тых яго дозах, якія ўтрымлівае глеба, можма людзям жыць і ў 30-кіламетроеай зоне. Але навошта, калі тут няма неабходнай інфраструктуры? Тым больш што і Украіна мае паўночныя тэрыторыі, чыстын вёскі на якіх выміраюць натуральным чынам. І яшчэ адзін элемент табліцы Мендзялеева прыцягвае асаблівую ўвагу навукоўцаў. Размова аб плутоніі-239.

— Ён мае перыяд паўраспаду 24 тысячы гадоў. За гэты тэрміч яго актыўнасць паменшыцца толькі ў два разы. Была 0,2кюры, будзе 0,1. Піраміды пабудавалі 4 тысячы гадоу таму, а плутоній распадзецца напалову праз 24 тысячы гадоў, — працягвае прасвятпяць Валерый Кашпараў. — Калі, вядома ж, не з'явяцца новыя тэхналогіі, не прыдумаюць, што з ім рабіць, і калі не дэзактывуюць гэтую тэрыторыю.

Работы па дэзактывацыі зямлі ў зоне даўно не вядуцца — іх завяршылі ў першыя гады пасля аварыі. Занадта каласальныя аб'ёмы зямлі, якую патрэбна зняць. Радыенукліды за гэты час праэміглавалі. Кабаныперарылізямлютак, што трэба знімаць практычна 20 сантыметраў.

— Палічыце — колькі гэта зямлі будзе — і куды яе потым падзець?—дырэктар Украінскага НДІ сельскагаспадарчай радыялогіі Нацыянальнага ўніверсітэта біярэсурсаў і прыродакарыстання Валерый Кашпараў ведае праблему асабіста. — У зоне каля 800 магільнікаў, дзе былі пахаваныя будматэрыялы, зямля. У 1987 годзе тэрыторыя вакоп станцыі была зантая, поўнасцю дэзактываванан — ніводнага дрэва не было. У першыя гады забруджаная зямля захоўвалася амаль што стыхійна, а потым прыйшлося весці работы па паспартызацыі магіпьнікаў.

Галоўны рэдактар газеты «Бранскі рэгіён» Віталь ХАРКЕВІЧ кажа, што на тэрыторыі Бранскай вобласці таксама існуе сёння праблема: дзе знаходзіцца знятая ў 1986 годзе і перапахаваная зямля. Ва ўкраінснай зоне адчужэння прыйшпося наноў шукаць і высвятляць, дзе тыя траншэі, у якіх былі закапаныя машыны, дрэвы, бетонкыя пліты...

У 1987годзе побач зЧарнобыльскайстанцыяй лесу адзін момант стаў рыжым. Хвоя тады пад уздзенннем вылікай дозы радыяцыі стала рудой і адразу апала. Сёння на гэтым месцы растуць нашчадкітых дрэў, якія знутры забруджаныя значна больш, чым іх продкі. Сутнасць у тым, што карані ідуць у магільнікі з забруджанай зямлёй — падыходзіць блізка да гэтых дрэў людзям не раяць. І растлумачваецца гэта вядомымі хімічнымі працэсамі, як кажа маш экскурсавод па зоне адчужэння біёлаг Валерый Кашпараў.

— Цэзій — поўны хімічны аналаг калію, жыццёва неабходнага элемента. Гэтак жа як стронцый — поўны аналаг кальцыю. Любы жывы арганізм разам з каліем і калыдыем бяруць цэзій і стронцый. Вось і дрэвы ў чарнобыльскай зоне іх увабралі.

Наступны пункт, які мы наведеаем — мёртвы горад Прыпяць.

Наступны пункт, які наведваюць журналісты — удзельнікі міжнароднага трэнінгу, прысвечанага жыццю на тэрыторыях, што пацярпелі ад Чарнобыльскай аварыі, — мёртвы горад Прыпяць. Вось тут трэба здымаць фільмы жахаў. Ці не было такіх спробаў? Як высветлілася, ідэя гэтая не арыгінальная. Дле пакуль што ўвасобіць яе ў жыццё не атрымліваецца. Тым часам часопіс Forbes апублікаваў у лістападзе гэтага года спіс самых унікальных мнсцінаў для турызму. Антарктыду, Манголію, Паўночную Карэю і іншыя краіны і гарады абышла Чарнобыльская АЭС, якая ў своеасаблівым рэйтынгу заняла першае месца.

Прынамсі, доза (менш за 0,01 мЗв) за паездку ў Чарнобыльскую зону — гэта менш, чым пры пералёце на самалёце ў Еўропу або рэнтгене зуба ў стаматолага. Эксперты гавораць, што кароткачасовае знаходжанне ў зоне не ўплывае на арганізм чалавека. Хоць раяць прытрымлівацца строгіх рэкамендацый. Такім

чынам, любы грамадзянін за $170 можа атрымаць комплексны ўрок па гісторыі і экалогіі.

Перад уездам у Прыпяць — яшчэ адзін шлагбаум. А далей з акна аўтобуса ўсё здаецца быццам нерэальным. Жылыя дамы ўсе яшчэ сучаснай архгтэктуры — будавалі ж з перспектывай, але ніводнага агеньчыка. Назвы вуліц захаваліся. Жоўтыя тэлефонныя будкі там і тут. Мы аб такіх і забыліся! Дрэвы буяюць. Гавораць, калі летам, дык з-за іх і будынкаў ужо амаль што не бачна.

— Тут быў палац культуры «Энергетык», вось адміністрацыйныя будымкі, упрыгожанын гербамі. Адзін — Савецкага Саюза, другі — УССР, — гаворыць экскурсавод.

Не арыгінальнай будзе і згадка пра знакаміты раман Стругацкіх — “Пікнік на абочыне”, больш вядомы па кінаўвасабленні Андрэя Таркоўскага «Сталкер». Гумар на-ведвальнікаў гэтага месца такі ж чорчы, нк і графіці, што з'явіліся на сценах дамоў у горадзе Прыпяць значна паэней, чым адбылася аварыя. Чорныя сілуэты, быццам пры-клеечыя да паверхняў—відовішча не дпя спабанервовых. Але ж такіх у групе журналістаў трох краін, якія закранула трагедыя, няма.

Горад Прыпяць памёр, не дасягнуўшы паўналецця. Ён быў заснаваны ў 1970 годзе, а ў 1966 ужо сышоў у вечнасць. Сярэдні ўзрост яго жыхароў быў на той момант 26 гадоў. Забяспячэнне харчаваннем тут было, як у Кіеве. Жыхары найбліжэйшых раёнаў, у тым ліку Беларусі, як мурашы, хутка знайшлі сюды дарогу па дэфіцытную у 70-я гады каўбасу. Ад Брагінскага раёна да Прыпяці — рукой падаць, вось і ездзіпі без усялякіх эбмежаванняў.

Амаль што 50 тысяч жыхароў гэтага гарадка ў адзін момакт пазбавіліся даху над галавой. Іх усіх вывеэлі за адзін дзень — 27 красавіка 1986 года. Расказваюць ці то праўду. ці то байку, як у спешцы бацькі забылі ў кватэры маленькую дзяўчынку. Калі ж за ёй вярчуліся, яна моцна спала, быццам нічога ў свеце і не адбывалася.

Аварыя, як цунамі, раскідала тады людзей па тэрыторыі ўсяго былога Саюза. да гэтага часу многія шукаюць адзін аднаго. Але ж хто змог, той скарыстаўся сітуацыяй агульнай неразбярыхі. Хто хацеў, той зрабіў з лімона, які яму дастаўся, лінанад. У матэрыялах міжнароднай навукова-інфармацыйнай сеткі па пытаннях Чарнобыля ІСН прыведзены такія факты: «У работах унутры 30 кіламетраў у 1986/87 гадахпрымаліўдзел каля 250 тысяч чалавек. Агульная копькасць ліквідатараў, якім былі выдадзены пасведчанні да канца 1991 года, не перавышала 350 тысяч. Агульная колькасць лікві-датараў, зарэгістраваных да гэтага часу ў нацыянальных рэгістрах Беларусі, Расіі і Украіны — больш за 500 тысяч чалаввк», Атрымліваецца: чым далей ад вайны, тым больш ветэранаў?

Але ж калі ў Беларусі асчоўныя чарнобыльскія дапамогі акамулявала дзяржава, то ва Украіне будуць да апошняга біцца за 6 (!!!) грывень на чалавека. Для даведкі: $1 сёння — каля 8 грывень. Пра «біцца» — не перабольшванне: некаторыя ўкраінскія калегі, калі размова пайшла аб магчымасці ўвасаблення ў іх краіне беларускага варыянта, ажно залямантавал!: у нас такі нумар чіколі че пройдзе.

Тым часам на Беларусі ў межах Чарнобыльскай праграмы велізарныя сумы штогод выдаткоўваюцца на меры па адраджэнчі сельскагаспадарчай вытворчасці, якія дазеаляюць выраблядь на эабруджаных тэрыторыях радыяцыйна чыстую прадукцыю. Ва Украіне— не больш за мільён долараў,— расказвае Валерый Кашпарау, дырэктар Украінскага НДІ сельскагаспадарчай радыялогіі Нацыянальнага ўніверсітэта біярэсурсаў і прыродакарыстання, адзіч з экспертаў міжнароднага трэнінгу для журналістаў.

— Крыніц фінансавання не хапае. У нас грошы. так званыя "чарнобыльскія", ідуць людзям у выглядзе даламог і размазваюцца па вялізчай тэрыторыі — кожнаму патроху, у выніку нічога, у адрозненне ад вас. У Беларусі фінансавыя сродкі сканцэнтраваныя і накіраваныя на выкананне пэўных праграм. У нас на контрмеры з гро-шай, выдаткаваных на Чарнобыль, траціцца 0,3 %. Што такое гэта ад усіх чарнобыльскіх выдаткаў? Калі выдаткоўваць хоць бы 2 %, мы вырашылі б праблему забруджанай прадукцы і перавышэння дозаў апраменьвання насельніцтва за адзін год! У нас ва Украіне ўся зямля цяпер прыватная, і пераспецыялізаваць яе можа толькі гаспадар. Дзяржава не можа прымаць контрмеры для насельніцтва на яго прыватных землях. А ў вас, беларусаў, захавалася цэнтралізаваная сістэма. Акрамя таго, у нас ёсць палітычныя пытанні, якія не дазваляюць праводзіць пэўныя

мерапрыемствы. Напрыклад, ніхто не будзе ўздымаць праблему адмены дапамог капярэдадні выбараў. А ў нас выбары — пастаянна.

Аднак вернемся ў горад Прыпяць. Сярод зімы тут радасна чыраванее шыпшына. Міжволі адзначаю, што яна звычайнай велічычі. Прынамсі, і каты, якіх мы сустракалі бліжэй да сталоўкі ў Чаркобылі, бегаюць ча чатырох лапах, маюць адзіч хвост і два вокі — усё че так, як ладказвае хворая фантазія.

Калі б мы не паспрабавалі забрацца ва апошні паверх гатэля — былі б не журналісты. Трэба ж здымак з верхняй кропкі зрабіідь! Тым больш, адсюль сапраўды ад-крываецца выдатны від на Чарнобыльскую станцыю — яна зусім побач, як на далоніі За цікаўнасць расплачваюцца нагамі, бо ліфт спынены тут таксама 23 гады таму.

Калісьці сюды, на верхнюю назіральную пляцоўку гатэля Полісся людзі прыходзілі адпачываць — мэбля захавалася, але ж сёння, як у музеі, нікому не трэба рабіць заўвагу: садзіцца нельга! Ніхто і не спрабуе. А вось нарэшце і сімвал абнаўлення прыроды: маладое дрэва прарастае праз пліты падлогі на апошнім паверсе будынка. Так, хутчэй за ўсё праз некаторы час тут усё абрушыцца. А пакуль трэба паспець знайсці цікавыя артэфакты мінулай эпохі. Яны побач. Вось даведнік на стале: «Эксплуатацыя жылых зданий». Актуальна. Вось бутэлькі на падваконні ў радок. Іх дакладна не грамадзяне без вызначавага месца жыхарства пакінулі. На падлозе сярод смецця — кніга ўліку матэрыяльных каштоўнасцнў. Усе неўзабаве ператварылася ў маральныя каштоўнасці — напаміны, асацыяцыі, эмоцыі... «Што наша жыццё? Гульня..." — можна падняць рукі ўгору і закаціць вочы, але ж рукі замерзлі, а нас чакаюць у аўтобусе калегі, якія шукалі артэфакты крыху ніжэй, чым мы.

— Зараз вы бачыце Прыпяць — правы прыток Дняпра. Магутная рака цячэ і праз Беларусь, і праз Украіну. Ну а зараз мы наведаем могілкі караблёў, — паведамляе наш суправаджальнік.

З маста праз Прыпяць, дзе мы прыпыняемся, бачны наш Брагінскі раёч. З другога боку — зноў жа Чарнобыпьская станцыя. Зразумела становіцца, чаму з нашага Камарына некаторыя лімылі за шчасце ездзіць туды на працу. А могілкі катэраў — яны ў затоцы, побач. Між іншым, пасля аварыі ўсю тэхніку, як і адзенне, якое выкарыстоўвалася пры ліквідацыі наступстваў, па меры сіл дэзактывавалі і закопвалі. Чаму рукі не дайшлі да гэтых плаўсродкаў? Адказу ўжо не будзе. Як варыянт: для таго, каб мы вывучалі гісторыю і не паўтаралі памылкі продкаў. Дыдактычна неяк атрымліваецца...

А ўздоўж дарогі ляжыць маленькі вазок для лялькі, кінуты нейкай прыгожай палескай дзяўчынкай...

Стаяць цагляныя дамы. Здаецца, ім бы капітальны рамонт — і сёння жыць можча. А вось адзіная царква ў зоне—дзейная. Ілья-прарок, у гонар якога яна названая, моліцца за гэтыя мясціны. І за людзей, якія не па сваёй волі іх пакінулі.

Міжтым,беднасць,ане радыяцыя, з'яўляецца асноўнай праблемай жыхароў забруджаных тэрыторый. Гэта неркаванне абагульнена экспертамі, якія ўдзельнічаюць у праекце Міжнароднай навукова-інфармацыйнай сеткі па пытаннях Чарнобыля (ICRIH). Але ж аб гэтым — у наступны раз.

И.Асташкевич

**Источник:** Звязда.-2009.-23 снеж.-С.10.